

магілёўскі
Выбар

№ 3 (25)
Люты
2013 г.

Абласная Дэмакратычная Трыбуна

ЗАПРАШЭННЕ НА ДУШЭЎНУЮ РАЗМОВУ

АДКРЫТЫ ЛІСТ ДА А.Р. ЛУКАШЭНКІ

Ужо каторы год запар да мяне звяртаюцца шматлікія жыхары Шклоўшчыны з прапановамі і просьбамі, каб я якімсці чынам распавёў вам інфармацыю аб негатыўных працэсах, што адбываюцца ў Шклоўскім раёне. Раёне, дзе вы зрабілі свае першыя жыццёвыя крокі... А ў далейшым ён стаў для вас і стартавай пляцоўкай у вялікую палітыку.



Я заўсёды аднекваўся ад падобных просьбаў і прапановаў, бо казка пра добрага "цара" і кепскіх "баяр" — гэта не для мяне.

Але апошнія вашыя выказванні ў адрас прадстаўнікоў апазіцыі на прэс-канферэнцыі 15 студзеня 2013 года ў Мінску, як кажуць, зачапілі мяне за жывое і прымусілі змяніць свае адносіны да просьбаў землякоў. Гэта вашыя словы аб тым, што нікога з апазіцыі вы не жадаеце бачыць у Беларусі на якіх-небудзь кіруючых пасадах. Бо, па вашых меркаваннях, гэта здраднікі інтарэсаў беларускага народу. Тут вы жадаеце бачыць людзей, якія змагаюцца за незалежную краіну, і змагаюцца рэальна, а не языком ляпаюць.

У час прэс-канферэнцыі вы нават далі непрывабную ацэнку шэрагу прадстаўнікоў апазіцыі, што ў свой час працавалі ў вашай камандзе, але па розных прычынах вымушаны былі сыйсці ад вас.

(Пачатак. Працяг на стар. 2)

СПОЎНІЛАСЯ 175 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВІКЕНЦІЯ КАНСТАНЦІНА КАЛІНОЎСКАГА (КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА)

"Толькі тады, народзе, зажывеш шчасьліва, калі над табою Маскаля ўжэ ня будзе"!

Кастусь Каліноўскі

Кастусь Каліноўскі нарадзіўся 2 лютага 1838 году ў вёсцы Мастаўляны пад Беластокам. Паходзіў са шляхецкага роду Каліноўскіх герба «Калінава», які паводле пісьмовых крыніцаў вядомы з XVII стагоддзя. Продкі Каліноўскага амаль сто гадоў валодалі маёнткам Калінава. Пасьля ягонага продажу у 1836 годзе бацька будучага кіраўніка паўстаньня заснаваў у Мастаўлянах ткацкую фабрыку, у 1849 годзе набыў фальварак Якушоўка паблізу мястэчка Свіслач Ваўкавыскага павета. Там прайшло дзяцінства Кастуся.

Першапачатковую адукацыю будучы рэвалюцыянер атрымаў у Сьвіслацкай павятовай навучальні. Вялікі ўплыў на яго меў старэйшы брат Віктар, які вучыўся ў Маскоўскім унівэрсытэце, вывучаў на даручэньне Віленскай археалягічнай камісіі старадаўнія беларускія рукапісы.

У 1856 годзе Кастусь паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбурскага ўнівэрсытэту, які скончыў праз чатыры гады з навуковай ступеньню кандыдата права. Ужо ў студэнцтве ён рашуча ступіў на сьцяжыну палітычнай барацьбы з самаўладзьдзем, разам з братам належаў да рэвалюцыйнага гуртку

(Пачатак. Працяг на стар. 4-5)

ЗАПРАШЭННЕ НА ДУШЭЎНУЮ РАЗМОВУ

(Працяг. Пачатак на стар. 1)



Рыгор Кастусёў

Я не бярусь даваць ацэнку працы вашых былых прыхільнікаў і паплечнікаў, якія сыйшлі ад вас у апазіцыю, але не з'ехалі з Беларусі. Размова і не пра тых, што працуюць на прасторах Расійскай Федэрацыі, як, напрыклад, Ціцянкоў, Рахманько, Бажэлка, пра якіх вы зараз маўчыце, хаця раней у адкрытую казалі аб скрадзеных імі з бюджэта Беларусі дзесятках і сотнях тысячаў долараў.

Сёння размова аб тым, што адбываецца ў Шклоўскім раёне. Раёне, які знаходзіцца пад асабістым вашым кантролем, не кажучы пра іншыя рэгіёны, дзе ўсялякі кантроль цалкам адсутнічае. Пастараюся выказаць свае меркаванні без эмоцыяў, каб яны не былі ўспрыняты як абраза. Гэта спроба на прыкладзе аднаго раёна паказаць некаторыя факты негатыву, што адбываюцца ва ўсёй краіне.

Адразу хачу адзначыць, што маё запрашэнне на душэўную размову не варта ўспрымаць як асабісты зварот для атрымання якіх-небудзь прэферэнцый, або просьбу для атрымання пасады, як гэта разумелі ў свой час некаторыя чыноўнікі.

Лічу, што са сваёй жыццёвай пазіцыяй і працоўным досведам я маю маральнае права даваць ацэнку сітуацыі, што склалася ў розных рэгёнах і краіне ў цэлым. Пацверджаннем гэтаму з'яўляюцца і вашыя выказванні ў мой бок у час прэзідэнцкай кампаніі 2010 года.

На сваім асабістым прыкладзе хачу паказаць вам парадак падбору кадраў на месцах. Такіх кадраў, якія, як вы кажаце, "змагаюцца за незалежную Беларусь", "а не языком ляпаюць".

Да лістапада 2001 года я працаваў на пасадзе дырэктара Шклоўскага раённага аб'яднання ЖКГ. У часы майго кіравання аб'яднаннем прадпрыемства неаднаразова выходзіла ў лідары не толькі па вобласці, а і ў краіне. На перыяд маёй працы на гэтай пасадзе выпаў этап падрыхтоўкі і правядзення ў Шклове рэспубліканскага свята "Дажынкі". У час падрыхтоўкі да свята раённае аб'яднанне ЖКГ з'яўлялася заказчыкам па рамонту, рэканструкцыі і будаўніцтву больш як трохсот аб'ектаў. З тае пары прайшло ўжо 12 год, але дагэтуль бачна добрая якасць выканання работ. Шклоўскія "Дажынкі" — адны з нешматлікіх, пасля якіх не было ўзбуджана крымінальных спраў.

Нягледзечы на гэта, па палітычных матывах, з-за асабістых "намаганняў" кіраўніка справамі прэзідэнта Г.Жураўковай і тагачаснага старшыні Шклоўскага райвыканкама А.Агеева ў лістападзе 2001 года я вымушаны быў сысці з пасады...

З тае пары прайшло 11 год. За гэты час з пасады кіраўніка Шклоўскай ЖКГ звольнены 4 дырэктары па прычыне злоўжывання службовым становішчам. Двое з іх ужо адседзілі пэўныя турэмныя тэрміны, адзін зараз знаходзіцца пад следствам. І самае цікавае, што тыя, хто адседзіў, ужо зноўку прэтэндуюць на пасаду.

Падобная чахарда з кіраўніцтвам ЖКГ прывяла да вялікай цякучасці кадраў, што ў сваю чаргу адмоўна адбіваецца на якасці камунальных паслугаў і выклікае занепакоенасць у шклаўчан станам камунальных аб'ектаў. А трохразовае за 10 год рашэнне Шклоўскага райвыканкама па раздзяленню і аб'яднанню "Водаканала" з "Жылкамгасам" выклікала хвалю анекдотаў сярод жыхароў горада і раёна.

І гэта ўсё адбываецца пад наглядам нязменнага намесніка старшыні Шклоўскага райвыканкама Я.Семянкевіча, які курыруе ЖКГ.

Не жадае заўважаць усяго гэтага і памочнік прэзідэнта па Магілёўскай вобласці Г.Лаўранкоў, адказны за падбор кадраў у вобласці. Тым больш, што Генадзь Міхайлавіч у свой час працаваў старшынём Шклоўскага райвыканкама і ведае шклоўскія кадры асабіста.

Не менш цікавыя рэчы адбываюцца ў сельскай гаспадарцы раёна. Аб чым сведчыць, напрыклад, факт знікнення 17 млрд. даінфляцыйных рублёў, выдзеленых з бюджэту на закупку буйной рагатай жывёлы для новапабудаванага комплексу ў в.Дабрэйка. Амаль два гады следства не можа вызначыць, дзе ж прапалі грошы, і хто ў гэтым вінаваты. А новы комплекс, пабудаваны за дзяржаўныя сродкі, да гэтай пары так і стаіць цалкам не запоўнены.

Не менш падобнага негатыву адбываецца і на іншых прадпрыемствах раёна (папяровая фабрыка "Спартак", завод газетнай паперы), што адмоўным чынам адбіваецца на вытворчых працэсах, а бывае прыводзіць і да аварый на "новых" тэхналагічных лініях, закупленных зусім нядаўна за бюджэтныя сродкі. Але ўсё ўмела замоўчваецца. Як гэта адбылося на заводзе газетнай паперы тры-чатыры дні таму назад.

Спробы сумленных людзей, якія працуюць на гэтых прадпрыемствах, супрацьстаяць

(Заканчэнне на стар. 3)

РАССЛЕДОВАНИЕ ЗАВЕРШЕНО, ДЕЛО ПЕРЕДАНО В СУД

Обвинение против климовичских правоохранителей рассмотрят в военном суде

На пресс-конференции 24 января председатель Следственного комитета Беларуси Валентин Шаев объявил, что прокуратура завершила расследование обстоятельств нашумевшего на всю страну преступления. Год назад, в январе 2012-го, были арестованы три сотрудника Климовичского РОВД, в том числе и сам начальник районного отдела внутренних дел. Событие получило громкий резонанс и широко обсуждалось в СМИ. Но только сейчас, после передачи дела в суд, можно говорить о том, что степень вины каждого из участников установлена и доказана следствием.



ЗАПРАШЭННЕ НА ДУШЭЎНУЮ РАЗМОВУ

(Заканч. Пачатак на стар. 1-2)

негатыўным з’явам, не маюць поспехаў. Яны проста вымушаны сыходзіць з пасадаў пад ціскам кіраўніцтва.

Падобныя факты яскрава сведчаць аб тым, што шматлікія кадры чыноўнікаў і кіраўнікоў, якіх вы прызначаеце разам са сваімі памочнікамі на разнастайныя адказныя пасады, змагаюцца не за Беларусь, а за свой уласны інтарэс. Працуючы на пасадах у Беларусі, за кошт беларусаў яны ствараюць сабе шляхі адступлення і запасныя “аэрадромы” па-за межамі краіны. У Расіі, Літве, Польшчы, іншых краінах Еўропы, набываючы там нерухомасць, уладкоўваючы туды на жыхарства сваіх дзетак...

Не лепш абстаяць справы і ў суседніх са Шкловам рэгіёнах: Бялынічах, Горках, Магілёве ды іншых. Але аб гэтым — іншым разам і пры тым, калі ў нас атрымаецца задушэўная размова.

Рыгор Кастусёў

В интервью «Советской Белоруссии» руководитель Следственного комитета РБ Валентин Шаев сообщил, что расследование было завершено в декабре прошлого года. Он конкретизировал некоторые детали: «Двоим бывшим сотрудникам Климовичского РОВД и старшему следователю предъявлены обвинения в получении взяток, превышении служебных полномочий, подстрекательстве к даче взяток, а также в совершении незаконных действий в отношении взрывчатых веществ. Уголовное дело прокурором уже направлено в суд».

Как стало известно, дело будет рассматриваться Борисовским межгарнизонным военным судом. Это связано не с упомянутыми взрывчатыми веществами, а вызвано последними изменениями в законодательстве. С сентября 2012 г. военные суды (трибуналы) заняли особое место в судебной системе Беларуси. Теперь уголовные дела по преступлениям, совершённым гражданами, имеющими статус военнослужащих, лиц рядового и начальствующего состава органов внутренних дел, Следственного комитета, органов финансовых расследований Комитета государственного контроля, органов и подразделений по чрезвычайным ситуациям, прокурорских работников, должностных лиц таможенных органов, выведены из юрисдикции гражданских судов и стали исключительной подсудностью военных судов. Поэтому дело климовичских правоохранителей передали в Борисовский межгарнизонный военный суд.

Валентин Шаев специально подчеркнул следующее: «Тут я хочу отметить, что Следственный комитет сор в своей избе не прячет. Преступление выявлено в самом начале нашей работы. Его подготовка и совершение имели место в 2011 году. Но никто не пытался замолчать факт мздоимства: уголовное дело возбуждено самим Председателем СК, а расследование шло под его непосредственным контролем». Заявление Валентина Шаева объясняется тем, что один из фигурантов уголовного дела на момент ареста являлся сотрудником Климовичского районного отдела Следственного комитета.

Остаётся добавить, что по имеющейся в нашем распоряжении информации, первые судебные заседания состоятся в феврале. Скорее всего, по мнению независимых экспертов, рассмотрение дела судом будет осуществляться в закрытом формате.

КАК ЭТО БЫЛО — Сообщение БЕЛТА от 19 января 2012 года:

Уголовное дело возбуждено в отношении группы сотрудников правоохранительных органов из Могилёвской области, сообщили корреспонденту БЕЛТА в отделе информации и связи с общественностью Следственного комитета Беларуси.

Как пояснили в ведомстве, Главным управлением по борьбе с организованной преступностью и коррупцией МВД и Следственным комитетом была пресечена преступная деятельность должностных лиц органов

(Окончание на стр. 5)

СПОЎНІЛАСЯ 175 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВІКЕНЦІЯ КАНСТАНЦІНА КАЛІНОЎСКАГА (КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА)

(Працяг. Пачат. на стар. 1)

Зыгмунта Серакоўскага і Ярослава Дамброўскага. На Бацькаўшчыну Каліноўскі вярнуўся ў 1861 годзе перакананым змагаром супроць царызму.

Кастусь стаўся стваральнікам і душой нелегальнай рэвалюцыйнай арганізацыі ў Горадні, разам з паплечнікамі езьдзіў па навакольных вёсках і мястэчках, дзе вёў прапаганду сярод сялянаў, рыхтуючы іх да паўстаньня. Гэтай мэце служыла і нелегальная беларуская газэта «Мужыцкая праўда», якую надзелены яскравым публіцыстычным і літаратурным талентам Каліноўскі пачаў выдаваць у 1862 годзе супольна з Феліксам Ражанскім, Станіславам Сангіным і Валерам Урублеўскім.

Аўтар і рэдактар бальшыні нумароў «Мужыцкае праўды», Каліноўскі сам браў удзел у яе пашырэньні: развозіў па вёсках, раскідваў на дарогах. Ён імкнуўся разьвеяць ілюзіі сялянаў, паказаць, што царскі маніфэст аб скасаваньні прыгоннага права - гэта чарговае ашуканства працоўнага люду. Кастусь заклікаў змагацца за тое, каб прыйшоў час, калі «ніколі ніякай нікому мужыкі паншчыны служыць ня будуць і ніякага ў казну аброку плаціць, і народ наш будзе вольны і шчасьлівы». Да канца 1862 году значным накладам выйшла шэсць нумароў «Мужыцкае праўды».

Апошні, сёмы нумар «Мужыцкае праўды» пабачыў сьвет ужо ў час нацыянальна-вызваленчага паўстаньня. Тут гучыць адкрыты заклік да змаганьня з расейскімі калянізатарамі: “”А пакуль яшчэ пара, трэба нашым хлопцам спяшаць зь віламі ды з косамі там, гдзе дабіваюцца волі да праўды, а мы, іх бацькі да жонкі нашы, сьцерагчы будзем да ўведамляць, адкуль на іх сягне нячыстая маскоўская сіла, да ад душы памагацьусялякімі спосабамі дзецюкам нашым, што за нас пойдуць біцца. А будзе ў нас вольнасьць, якой не было нашым дзядам ды бацькам».

Прайшло больш за стагодзьдзе, але палымяны пратэст выдаўцоў газэты супраць каляніяльнай палітыкі Расейскай імпэрыі, заклік здабыць сапраўдную волю і незалежнасьць ня страцілі сваёй актуальнасьці. Невыпадкова поўныя тэксты «Мужыцкае праўды» ў Беларусі удалося надрукаваць толькі ў 1988 годзе.

Пасьля загаду аб ягоным арышце Каліноўскі дзейнічаў пад канспірацыйнымі прозьвішчамі Макарэвіч, Чарнецкі, Хамовіч, Хамуціус... Увосень 1862-га ён узначаліў Літоўскі правінцыйны камітэт, што рыхтаваў вызвольнае паўстаньне ў Беларусі. Кастусь стаяў на чале найбольш пасьлядоўных рэвалюцыянераў, якіх адрозна ад лібэралаў («белых») называлі «чырвонымі». Яны выступалі супроць саслоўнай няроўнасьці, за дэмакратычную рэспубліку, за перадачу зямлі сялянам. Каліноўскі лічыў, што народы Беларусі, Летувы ды Ўкраіны павінны самі разьвязаць пытаньне пра сваю незалежнасьць. «Белыя» ж лічылі галоўнаю задачай аднаўленьне Рэчы Паспалітай у межах 1772 году.

Першыя паўстанцкія атрады прыйшлі на Беларусь з Польшчы ў канцы студзеня 1863 году, але ўвесну пачалі фармавацца мясцовыя аддзелы. Адразу пачаліся сутычкі з расейскімі акупацыйнымі войскамі. Баявыя дзеяньні насілі характар партызанскай вайны з-за значнай колькасьці царскіх войскаў, што былі перакінутыя на Беларусь. Прыходзячы ў вёску ці мястэчка, паўстанцы склікалі сходы жыхароў, абвяшчалі ім маніфэст і аграрныя дэкрэты, складалі акты аб перадачы зямлі ва ўласнасць сялянаў, прымалі ад іх прысягу на вернасьць рэвалюцыйнаму



Кастусь Каліноўскі

ураду, зьнішчалі дакуманты валасных канцылярый, а сабраныя з сялян падаці вярталі ім. Матэрыяльнае забяспячэньне атрадаў ускладвалася на памешчыкаў. Усяго на тэрыторыі Беларусі адбылося больш за 50 баёў і сутычак паўстанцаў з царскімі войскамі - у асноўным арэнай баявых дзеяньняў сталі Гарадзеншчына і Віленшчына.

Пасьля пачатку паўстаньня «белым» удалося адхіліць Каліноўскага і ягоных паплечнікаў ад кіраўніцтва. Ён стаў паўстанцкім камісарам Гарадзенскай губэрні, здолеў прыцягнуць да ўдзелу ў збройнай барацьбе шмат сялянаў.

Улетку 1863 году Кастусь зноў узяў у свае рукі кіраўніцтва віленскім паўстанцкім цэнтрам, які часам называлі «чырвоным жондам».

Паўстаньне ў Беларусі ўжо задыхалася. Адзін зь інсургентаў - паўстанцкі камісар Магілеўскай губэрні Вітаўт Парфіяновіч - на допыце выдаў Каліноўскага. У лютым 1864 году «кіраўнік паўстаньня, што жыў уВільні ў Сьвятаянскіх мурох (побач з саборам сьвятога Яна) пад імем Ігната Вітажэнца, трапіў у рукі царскіх жандараў. У часе сьледства і суду Кастусь трымаўся надзвычай мужна.

(Заканчэнне на стар. 5)

СПОЎНІЛАСЯ 175 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВІКЕНЦІЯ КАНСТАНЦІНА КАЛІНОЎСКАГА (КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА)

(Заканч. Пачатак на стар. 1, 4)

На прапанову аблегчыць свой лёс, назваўшы некаторыя адрасы і імёны, ён адказаў: «Калі грамадзкая шчырасьць ёсьць дабрачыннасьцю, то шпіёнства апаганьвае чалавека. Усьведамленьне гонару, уласнае годнасьці і таго становішча, якое я займаў у грамадзтве, не дазваляюць мнеісьці па іншым шляху».

Царскі ваенна-палявы суд вынес настанову: пакараць правадыра інсургентаў сьмерцю на шыбеніцы. Прысуд быў выканаы 22 сакавіка 1864 году на віленскім гандлёвым пляцы Лукішкі. Слухаючы на эшафоце вырак, у якім кіраўнік паўстанцаў быў названы «дворянином Калиновским», ён выгукнуў: «У нас няма дваранаў, у нас усе роўныя!»

«Толькі тады народзе зажывеш шчасьліва, калі маскаля над табой ужо ня будзе» - напісаў Каліноўскі ў адным з нумароў «Мужыцкай праўды» - гэтыя словы славутага змагара і нацыяналіста ня страцілі саёй актуальнасьці і сёньня.

По матэрыялах газеты "Бялыніцкая даўніна"

ДЛЯ ГРАМАДСКАГА АКТЫВІСТА Ў БЫХАВЕ НЯМА НІЯКАЙ ПРАЦЫ?

Вось ужо на працягу некалькіх месяцаў грамадскі актывіст з Быхава Арцём Антонаў не можа ўладкавацца на працу ў родным горадзе пасля заканчэння службы ў войску. Падставы для адмовы ў працаўладкаванні ў розных арганізацыях называюць самыя розныя, аднак у прыватных гутарках кажуць зусім іншае – не возьмем, бо не хочам праблем у адносінах з мясцовай уладай.

Справа ў тым, што Арцём Антонаў актыўна ўдзельнічае ў грамадскай дзейнасці ў Быхаўскім раёне, пастаянна распаўсюджвае разнастайныя інфармацыйныя ўлёткі, нумары незалежнай газеты "Стары замак". Немалаважна таксама, што бацькам дваццацігадовага Арцёма Антонава з'яўляецца вядомы быхаўскі пісьменнік і журналіст, старшыня раённай арганізацыі партыі і Руху БНФ "Адраджэнне" Сяргей Антонаў, які з-за сваіх крытычных артыкулаў у розных СМІ у адрас мясцовай "вертыкалі" мае з ёй вельмі складаныя адносіны.

"Што казаць, калі ў некаторых арганізацыях у сына адразу ж пытаюцца "вы сын Сяргея Валянцінавіча?" і пасля атрымання станоўчага адказу, адразу ж паведамляюць, што працы для яго няма, - распавядае Сяргей Антонаў. – Наогул, гісторыя гэта



цягнецца ўжо даволі даўно. Яшчэ ў анкеце прызыўной камісіі Арцём быў напісаў, што з'яўляецца сябрам Партыі БНФ. Пасля гэтага ваенком адмовіў яму ў накіраванні на курсы кіроўцаў аўтамабіляў, у той жа час дваіх іншых жадаючых вучыцца на кіроўцу ваенкамат адправіў без усялякіх праблем. Арцёму ўсё ж удалося дабіцца накіравання ад раённага цэнтра занятасці, ён скончыў курсы і атрымаў пасведчанне кіроўцы катэгорый "В" і "С". Аднак служыць быў накіраваны чамусьці ў вайсковую частку, дзе стаж кіроўцы зарабіць было не магчыма – у роту ахова".

З службы ў войску Арцём Антонаў вярнуўся у жніўні 2012 года.

"Пасля дэмабілізацыі Арцём адразу спрабаваў прайсці камісію, каб уладкавацца на працу ў ахоўную структуру Мінскага метрапалітэна, - кажа Сяргей Антонаў. – Нягледзячы на паўтары гады службы ў адпаведнай вайсковай частцы, добрае здароўе і выдатныя характарыстыкі з месца службы, камісію ён не прайшоў з-за псіхалагічнага сумоўя. Прычым яго вынікаў мы чакалі не тыдзень-паўтара, як звычайна, а месяц.

Спрабаваў ён уладкавацца ў якую-небудзь ахоўную структуру ў Быхаве, усе спробы аказаліся безвыніковыя. Пасля гэтага я параіў яму паспрабаваць знайсці ў Быхаве хоць бы самую прастую працу, якая заўсёды патрэбна – працу грузчыка. Прызнацца, я нават сам гэтага не чакаў – яму ўладкавацца на працу ў Быхаве нават грузчыкам аказалась немагчыма. Не бяруць ні ў дзяржаўныя, ні ў прыватныя арганізацыі, прычыны для адмовы выдумляюць самыя розныя"…

Іван Барысаў

КАК ЭТО БЫЛО...

(Оконч. Начало на стр. 3)

внутренних дел и предварительного расследования Климовичского района, которые вымогали у предпринимателя 500 тыс. долларов. Путём шантажа и угроз в декабре 2011 года и январе 2012 года они получили около 8 млн. российских рублей за непривлечение этого человека к уголовной ответственности.

Однако 18 января при получении очередной части денег (500 тыс. российских рублей) они были задержаны. Среди задержанных старший оперуполномоченный Климовичского РОВД и старший следователь Климовичского райотдела УСК по Могилевской области. Установлено, что в преступную группу входил также начальник Климовичского РОВД. Председателем СК Беларуси в отношении этих лиц возбуждено уголовное дело по признакам преступления, предусмотренного ч.3 ст.430 УК Беларуси (получение взятки в особо крупном размере).

Тимур Незванов

В редакцию газеты "Магілёўскі Выбар" обратился с просьбой опубликовать его открытое письмо о проблемах, которые существуют в работе одного из сельхозпредприятий Белыничского района – СПК "Лебедянка", – бывший депутат Белыничского районного Совета депутатов Валерий Усик.

Валерий Усик - человек в Белыничском районе уважаемый. Он не один год отработал главным ветеринарным врачом в СПК "Лебедянка", избирался депутатом Белыничского райсовета. И сейчас, после выхода на пенсию, Валерий Демидович продолжает постоянно оказывать посильную помощь родному хозяйству. Однако квалифицированного специалиста не могут не волновать проблемы в деятельности сельхозпредприятия, которые в последнее время нарастают, как снежный ком. СПК "Лебедянка" находится в глубоком минусе буквально по всем экономическим показателям, но, к глубокому сожалению, ни районные, ни областные власти не принимают никаких мер для исправления ситуации, несмотря на обращения Валерия Усика в самые различные инстанции. Мы публикуем обращение Валерия Усика и просим соответсвующие органы государственной власти разобраться и принять меры для исправления ситуации.

ЧТО ИЗМЕНИЛОСЬ ЗА ПОСЛЕДНИЕ НЕСКОЛЬКО ЛЕТ В СПК «ЛЕБЕДЯНКА»?

Уже семь лет в СПК «Лебедянка» реконструируется здание фермы для дойного стада на 140 голов. За это время списано и разворовано бюджетных стройматериалов столько, что можно было бы построить, как минимум, два новых сарая. Задумали "евроремонт" в здании конторы хозяйства, так прежде чем начать ремонт в конторе, отдельные личности из руководства СПК "Лебедянка" начали ремонт у себя дома из этих стройматериалов. Составили фиктивные акты и после списали эти материалы. Закупило хозяйство семенной картофель на сумму более 6 миллионов рублей. Привезли, посеяли, обрабатывали, убирали, сложили в бокс на мех. дворе, ключи от дверей председатель хозяйства сдал не заведующему складом, а почему-то отдал своей племяннице. А вечером, когда рабочие уходили с мех. двора, родственники председателя заезжали на личных автомобилях, загружали, вывозили картофель и продавали, деньги оставляли себе. В итоге за 40 тонн оприходованного картофеля в кассу хозяйства поступило только 2 миллиона рублей денег. Картофеля же было фактически около 60 тонн. Оставшийся картофель положили в бурт и он за зиму просто сгнил. Весной вывезли сгнивший картофель на свалку, а потом списали – якобы скормили коровам, телятам. Посеяли 170 га льна, вырос лён отменный, метровой высоты. После вытеребили полученный урожай льна, положили на лёжку и забыли про него. Вспомнили только тогда, когда лён сгнил. Чтобы уйти от ответсвенности, администрация хозяйства составила фиктивный акт, будто бы этот лён неправильный, опасный для здоровья и не имеет волокна. Хозяйство понесло колоссальные убытки, одни использованные химикаты стоят огромных денег.



В СПК "Лебедянка" убивается скот, продаётся предпринимателям, но документы оформляются на подставных лиц из числа членов хозяйства. Возможно, руководство хозяйства имеет "откат" в 15% от общей суммы, как у нас зачастую бывает в таких случаях. А рядом Россия,где цена в два раза дороже за один килограм мяса. Какой нормальный хозяин будет резать телят молочного периода, а у нас в хозяйстве режут. Почему? Да потому, что идёт падёж и, чтобы его прикрыть, оформляют павшего телёнка на бедную доярку, - якобы зарезали и она забрала мясо.

Между тем, падёж скота идёт в первую очередь из-за отвратительного качества имеющихся в СПК "Лебедянка" кормов, за заготовку которых, кстати, многие из представителей администрации хозяйства получили

(Продолжение на стр. 7)

ЧТО ИЗМЕНИЛОСЬ ЗА ПОСЛЕДНИЕ НЕСКОЛЬКО ЛЕТ В СПК «ЛЕБЕДЯНКА»?

(Продолж. Начало на стр. 6)

солидные премии. Что говорить, когда трактор с силосом проезжает по улице, то просто невозможно дышать из-за кислого гнилостного запаха корма.

Воровство топлива в хозяйстве достигло невиданных размеров. Три родственника председателя СПК "Лебедянка" работают трактористами. А главный аграном является женой его брата и матерью двух племянников. Только у одного брата председателя за год разница между заправкой и фактическим потреблением топлива двигателем составила около 13 тысяч литров. Списывается топливо путём приписок объёмов выполненных работ, припиской отработанных техникой часов. А ведь на каждом двигателе стоит счётчик, где указано, сколько двигатель потребил топлива и его легко можно проверить. Фактическая урожайность зерновых в хозяйстве в этом году составила 16 ц/га, но в отчёте в район было указано 29 ц/га. Одна и таже работа в СПК "Лебедянка" оценивается по разному. Работает тракторист, не родственник председателя, топлива выдаётся в два раза меньше, чем трактористу, - родственнику председателя СПК. Главный агроном со средним специальным образованием, работает по старинке, на какие-либо курсы повышения квалификации за новыми знаниями практически не ездит. Откуда тут быть хорошей урожайности и нормальному состоянию полей. Более того, главный агроном систематически уходит в запой по 5-7 дней и всё нормально, никаких мер не принимается. Чтобы както "отличиться" перад районным начальством, начали убирать посеянный овёс раньше времени, ещё зелёным, свалили в бурт 200 тонн, где этот овёс и сгнил. Приехала комиссия с района, посоветовали "пережарить", а толку, - получилась мякина. В итоге хозяйство потеряло уйму денег из-за безответственности его руководства.

Родственники председателя и некоторые приближённые свои приусадебные участки обрабатывают, засевают, вносят ядохимикаты и т. д., за счёт хозяйства. А потом списывают, якобы всё пошло на посев, обработку полей, принадлежащих хозяйству, - отсюда, во многом, и низкая урожайность, большая засорённость полей, и миллиардные долги и убытки СПК "Лебедянка".

За бесценок распродаются коммерсантам уже засеянные поля, причём, не спрашивая разрешения на эти действия у членов кооператива, - наверное, потому, что отдельные имеют за это "откат".

Можно ещё долго перечислять случаи воровства, приписок и бесхозяйственности в СПК "Лебедянка". Но, к сожалению, это абсолютно не волнует вышестоящие соответствующие службы, потому что их устраивает "удобный" руководитель – что "скажут", то и делает, надо приписать – припишет, и т. д. Честную ревизию проводить не хотят, ссылаясь на то, что надо возбудить уголовное дело. А чтобы возбудить уголовное дело, надо провести ревизию: "ревизия-уголовное, - уголовное-ревизия" – один на одного пальцем показывают и на этом точка. Стыд и срам. Российская и итальянская мафии по сравнению с белыничской отдыхают.

За свои долгие годы работы я впервые вижу таких бездарных, безграмотных районных чиновников. Приписки – это их хобби, а есть и кое-что посерьёзней…

Касаясь районной газеты "Зара над Друццю", считаю её карманной, где работают не корреспонденты, а блюдолизы… Мне противно её брать в руки, поэтому её и не выписываю – ни одного критического материала. А ведь сколько бардака в районе, однако журналистам районки своя рубаха ближе к телу, чем справедливость и честность.

В Белыничском районе СПК "Лебедянка" имеет самую низкую отдачу от хозяйственной деятельности, т.е, цена производства намного выше цены реализации, а зарплата у родственников председателя СПК одна из самых высоких в районе. Неоднократно рассказывал об этих и других злоупотреблениях представителям местной власти и журналистам районной газеты, но коррупция, которая создана в районе, не пробиваема. Спрашиваю у корреспондента и районного чиновника: "Почему не опубликуете в статистической отчётности цену производства продукции и цену её реализации"? Один отвечает, что "за это меня выгонят с работы", а второй, что "народ нас не поймёт". Боятся правдивой информации, отчётность в процентах – это ни что иное, как лапша на уши народу. Кому она нужна.

Я неоднократно информировал о проблемах в работе СПК "Лебедянка" и районную прессу, и областную, и т. д., но опубликовывать всё выше перечисленное не хотят, боятся. Значит, правда у нас почему-то вне закона. Проинформировал даже службу Президента – результат нулевой. Спускают по лестнице вниз "для дальнейшего рассмотрения", а внизу мафия, которая покрывает то, что она породила. Потому что такие хозяйства, в которые вбрасываются миллиарды и нет отдачи, являются "дойной коровой". Вот объявлен год бережливости, экономии. Сколько таких лет проходят один за другим, а толку, - одни убытки, убытки… Ворон ворону глаз не выклюет, рука руку моет. Как противно на всё это смотреть. В наше время безнаказанно воровать начальнику – это как два пальца оплевать…

(Окончание на стр. 8)

ЧТО ИЗМЕНИЛОСЬ ЗА ПОСЛЕДНИЕ НЕСКОЛЬКО ЛЕТ В СПК «ЛЕБЕДЯНКА»?

(Оконч. Начало на стр. 6, 7)

PS. Дали председателю СПК «Лебедянка» Белову П. М. квартиру, так он разморозил отопление. Бросил эту квартиру и перебрался в другую, новую, только что построенную. А кто будет восстанавливать размороженные трубы и радиаторы? Конечно, восстановят за счёт хозяйства, но не из кармана виновника. Отдельные трактористы используют технику хозяйства, как свою собственную, никакой выписки за услуги, которые они оказывают. Деньги лопатой гребут себе в карман, а топливо списывают на якобы произведенные работы в хозяйстве.

Валерий Усик

ГОТОВИТСЯ УГОЛОВНОЕ ДЕЛО

На пресс-конференции в Могилеве начальник УВД Могилевского облисполкома Федор Балейко сообщил, что проведенная сотрудниками милиции проверка на РПУП “Завод газетной бумаги” в Шкловском районе Могилевской области выявила хищения, по которым готовится к возбуждению уголовное дело, пишет БелаПАН.

Напомним, в декабре 2012 года директор РПУП “Завод газетной бумаги” Анатолий Хмелевский подтвердил БелаПАН факт проверки предприятия сотрудниками областного отдела по борьбе с экономическими преступлениями (ОБЭП).

В то же время Балейко отметил, что пока говорить о результатах проверки рано. “Проверка проводится в отношении должностных лиц. Результаты будут. Установлены факты хищения. Уголовное дело пока не возбуждено, но будет возбуждено в ближайшее время”, — заявил он.

МАГІЛЁЎ АДЗНАЧЫЎ ГАДАВІНУ МАГДЭБУРГСКАГА ПРАВА



28 студзеня ў Магілёве прайшла святочная вечарына, прымеркаваная да 436-й гадавіны набыцця горадам Магдэбургскага права.

“Атрыманне Магілёвам Магдэбургскага права - гэта была найвялікшая дата ў гісторыі горада. Яна павінна стаць для яго святочнай. Раней Магілёў быў паселішчам, затым стаў местам. Мы павінны памятаць слаўныя старонкі нашай гісторыі”, - заявіў БелаПАН кіраўнік грамадскай ініцыятывы “Грамадскі магістрат” , які выступіў арганізатарам мерапрыемства, Аляксандр Сілкоў.

За некалькі дзён да імпрэзы “Грамадскі магістрат” вызначыў “Чалавека 2012 года” і “Падзею 2012 года” ў Магілёве. У першай намінацыі ўзнагародай быў ушанараваны праваабаронца Барыс Бухель. “Для мяне гэта было нечакана, дзякую. Я стараюся, працую, увесь час суды, абарона людзей, якія рэгулярна звяртаюцца”, - сказаў Бухель пасля атрымання граматы ад “Грамадкага магістрата” і падарункаў ад кампаніі “Будзьма беларусамі”. Ён дадаў, што адзін бы працаваць не здолеў. “Аднаму было б немагчыма - ні выжыць, ні працаваць. Хтосьці тэхнічна, хтосьці кампутарамі, хтосьці аўтамабілем, хтосьці парадай дапамагае, калі ўзнікаюць праблемы”, - адзначыў Бухель.

“Падзеяй года” паводле версіі “Грамадскага магістрата” ў Магілёве стала набыццё Музеем гісторыі Статута ВКЛ. “Галоўнае - гэта не граматы і падарункі, галоўнае - надалей працаваць і рабіць добрыя справы. Я бачу поўную адпаведнасць падзеі гэтай узнагародзе, таму што падзея адбылася дзякуючы грамадскім дзеянняў, грамадскім ахвяраванням. Грамадскасць прызнала, што яна зрабіла годную справу”, - заявіў дырэктар Музея гісторыі Магілёва Аляксей Бацюкоў пасля ўзнагароджання граматай і падарункамі.

Таксама падарункі атрымалі тры чалавекі, якія напісалі найбольш цікавыя эсэ пра будучыню Магілёва. Пасля адбыўся канцэрт вядомага музыкі Зміцера Вайцюшкевіча, які павіншаваў магілёўцаў са значнай для іх датай.

ИГРА В ШАШКИ

У троих могилевчан арестованы автомобили за нелегальную работу таксистами. Ведется проверка.

Перевозчики попали в поле зрение сотрудников налоговой инспекции на прошлой неделе. Водители оказывали горожанам услуги таксистов, и даже имели на автомобилях так называемые «шашечки». Однако в качестве предпринимателей не зарегистрировались. Составлены административные протоколы. Нелегальным перевозчикам грозит штраф в размере до 10 миллионов рублей каждому и конфискация автомобиля, сообщает ТРК “Могилёв”.

магілёўскі
Выбар

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі

Адрас рэдакцыі: Магілёўская воб, аг-к В. Машчаніца, вул. Савецкая, д.4. Тэл. 8 - 0259 204 308, e-mail: Boris152@gmail.com. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Наклад: 299 асобнікаў, фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 01.02.2013 г. у 09-00.